# У зеніце творчых сіл



Споўнілася 75 год вядомаму беларускаму вучонаму-медыку, заслужанаму дзеячу навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі, прафесару кафедры дэрматавенералогіі Віцебскага медыцынскага інстытута Леаніду Іванавічу Багдановічу. За плячыма юбіляра — нялёгкае, але чэсна пражытае жыццё, апаленае Вялікай Айчыннай вайной. У чэрвені 1941 года віцебскі юнак Леанід Багдановіч паспяхова закончыў СШ № 27, марыў аб прафесіі настаўніка матэматыкі і фізікі. Але вайна распарадзілася па-свойму. Ён быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, скончыў артылерыйскае вучылішча. Малады лейтэнант камандаваў агнявым узводам на Волхаўскім і Ленінградскім франтах. Летам 43-га быў цяжка паранены, перанёс 9 складаных аперацый. Менавіта тады малады вайсковец вырашыў канчаткова: буду ўрачом!

У 1949 годзе Л.І.Багдановіч з адзнакай скончыў Віцебскі медінстытут, потым клінічную ардынатуру, працаваў асістэнтам кафедры скурных і венерычных хвароб роднай ВНУ, абараніў кандыдацкую, затым доктарскую дысертацыі. Амаль 40 год — з 1958 па 1996 гг. — прафесар Багдановіч узначальваў кафедру дэрматалогіі ВМІ. Доўгі час Леанід Іванавіч быў членам праўлення Усесаюзнага таварыства дэрматавенеролагаў, навуковым кіраўніком СНТ, старшынёй камітэта абароны міру, з'яўляецца членам савета па абароне дысертацый Мінскага медінстытута, членам Рэспубліканскага таварыства дэрматавенеролагаў. Ёсць у прафесара яшчэ адно захапленне — рыбалка. Ён прызнаны аўтарытэт сярод рыбакоў інстытута.

У рэспубліцы і вобласці добра вядомы яго бацька Іван Іларыёнавіч Багдановіч — дацэнт, заслужаны ўрач БССР, былы рэктар ВМІ, таксама выдатны ўрач-дэрматолаг, малодшы брат Георгій — вопытны кардыёлаг. Жонка юбіляра, яго дачка і зяць — таксама ўрачы, выпускнікі Віцебскага медыцынскага інстытута.

**Л.ЦІТОЎ,**
**дацэнт ВМІ.**